Беларускі шлях

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня. Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя накідае за сабой права папраукяць нерасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 63. Менск. Нядзеля 9 чэрвеня 1918 г. Год I

Менск 9/VI.

За сем месяцау большэвіцкаго панавання над Расіяй усе ясьней і часьцей чуем аб гэтых крэціу «савецкай» рэспублікі сьпісках. Гэтыя сьпіскі накуль што сьведчаць толькі аб слабасьці у якую кінула рэвалюцыя быўшую імпэрыю.

Бо—большэвікі усе іпшэ панують. Як доуга працягнецца іх панаванне ніхто ні можа сказаць, але што утрымацца на зауседы з сваімі парадкамі ім ні удасца гэто пэуна. Пэунасьць караніцца у тым, што апрача развалу, быўшая імпэрыя загнівае у самым цэнтры. Тамака работнікі і селяне ужо зніверыліся у большэвіках засмакавалі анархіі і цяпер чакаюць новых «збавіцеляу».

І яны павінны будуць прыйсьці. З чым яны прыйдуць, з фрыгійскім коупаком на нацыянальным знамені, чы с кароною і багроуцам, гэта аднакова, бо гэта будзе р э а к ц ы я. За яе стаіць цяпер у Вялікаросіі уся інтэлігэнцыя. І калі яна будзе нілітасьцівай у цэнтру, то у пазастаўшых «акраінах» лютаваціме іпшэ го; ні. Нават за тымі што ужо адвяліліся ад Расіі зноу працягне сваю заборную руку.

Підзержаўныя народы бароначыся ад анархіі «уцякалі» ад Вялікаросіі. Іпшэ менш ім патрэбна рэакцыя.

Перад тварам таго, што пасоуваецца на Вялікаросію яны павінны удвоіцць свае усілкі каб палажыць паміж ей і сабою ніпераходную граніцу. Рэакцыю, як і анархію—у какарантын!

Агульныя вестки.

ГААГА. Урадовае англіцкае апавешчэнне паказывае:

«Вярхоўная ваенная рада адбыла сваё шостае заседанне пры вельмі сур'езных для вольных народаў варунках. Нямецкі ўрад, асвабадзіўшыся ад усялякаго націску на усходнім фронці, сабраў усё свае сілы на захадзі. Ен прабуе цяпер дайсьці на заходнім фронці развязкі перш чым саюзныя дзержавы здалеюць развіць, як сьлед, свае сілы. Пэравага, якую ворагі маюць дзякуючы стратэгічнаму разьмяшчэнню сваіх войск і сваім чыгункам, дала ім магчымасьць дайсьці сперша ўдачы. Яны напэўна пачнуць ізноў свае атакі і німа споркі, што саюзнікі могуць спадзевацца іпшэ больш крытычных дзён. Вярхоўная ваенная рада пераконана, што саюзьнікі перанясуць гэтые спробы с такой-жа адвагай, якую яны выявілі, бароначы праўду, і што яны праз нейкі час прымусяць ворагоў пакарыцца. Вярхоўная ваенная рада зусім даверае генаралу Фошу і пышаецца адвагай саюзьніцкіх войск. Зробленыя крокі ўчыняць пабеду для ворагаў недасяжнай. Найвышэйшая глаўная каманда жджэ с поўнай верай аканчацельнай развязкі. Саюзныя ўрады пастанавілі ні выдаваць бэрлінскаму дэспотызму ніводнаго народу. Мы з верай вытрываем да канца, каб забяспечыць пабеду і свабоду сьвету».

БЭРН. У англіцкай Ніжняй Палаце дэпутат Годж запытаўся у ураду аб цэнзурным скарочванні міністэрскіх прамоў. У сваей апошняй прамове у Глясго генэрал Смутс сказаў, як кажуць, што ні сьлед спадзевацца пабеды на заходнім фронці і што з гэтае прычыны неразум выступаць у самым пачатку проці кожнае спробы дайсьці згоды.

Бонар Лёў прабаваў сперша прызнаць нігодным веры, што Смутс мог нешта падобнае сказаць. Але на далейшыя адказы оппонэнтаў палічыў лепш ні даваць адказу.

Дэпутат Прындж запытаўся аб цэнзуры прамовы міністра працы Барнса.

Бонар Лёў прызнаў, што цэнзура была, але на моцы згоды самаго Барнса.

ЖЭНЭВА. Орган Клемансо L'home libre» паказвае, што нямецкае наступленне с 60 кіл. пашырылося на 90, а пасьля на 130 кіл. Францускія рэзэрвы гэтак прыходзіцца расставіць на ўсей гэнай лініі.

БЭРН (В.Т.Б.). Міністэр стрававання, Крэпсі, тэлеграмай загадаў самую срогую дысцыпліну пры спажыванні. Ен асьцярагае церад ілюзіей будучаго ураджаю.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Панцырныя самаходы, каторыя 27 мая атакавалі французкія пазыцыі між Зімовай гарой і Бэрры-о-Бак, былі здабыты намі у англічан пры іх пасьпешным адступленні на Амьен. Дарэмна варожыя батарэі памыкаліся задержаць іх. З 20 толькі два былі разьбіты ўдачнымі стрэламі. Астаўшыеся жывымі людзі з гэтых самаходаў, маючы пры сабе ручныя гранаты, прылучыліся да нашае штурмаваўшае пяхоты. Пад зашчытай нашых панцырных самаходаў наша пяхота дайшла да варожых акопаў без вялікшых страт.

ГААГА. Міністэр заграничных спраў заявіў:

«Саюзныя урады згодзіліся на выезд з заморскіх портаў у Голяндыю трох караблёў з зерном. Я атрымаў ад немцаў і саюзнікаў пэуные заверэння, што новы рух упярод і назад будзе адбывацца без перашкод.

МАРСЭЛЬ (Рэутэр). Пры ўзрыве фабрыкі амуніцыі ў Суасоне 3/VI забіты 100, ранены 60 душ.

БЭРЛІН. У р а д о в а. Нашыя падводныя лодкі затапілі ізноў у канале 5 параходаў і 3 рыбаловы ёмкасьцю разам больш за 28.000 тонн.

ЛЮБЭК. Першыя чатыры фінляндзкія параходы прыбылі сюды, разгрузіліся, прынялі новы груз і выехалі назад.

Весткі з Расіі.

— Расійсія газэты, пасьля дэкрэту рады народных камісароў аб нацыяналізацыі расійскіх цукравых заводаў, пачалі абсуджаць цяперашняе становішчо цукравой прамысловасьці:

У Расіі да вайны работалі ўсяго 246 цукравых заводаў са штогадовай прадуктыўнасьцю ад 110 да 120 мільёнаў пудоў. Цукравы расход у Расіі нівышэй 90 мільёнаў пудоў; ад 30 да 40 мільёнаў пудоў аставаліcь такім чынам што год у свабодным распараджэнні. З гэтаго ліку 3—4 мільёны прэдастаўляліcь Фінляндзіі і столькі жа вывозілося у Пэрсію, рэшта ўходзіла у склад нірухомаго запаса. Ні гледзючы на сільны упадак цукравого прадукта за час рэвалюцыі, на глаўных цукравых складах у Украіне усёж іпшэ знаходзілося 10—15 мільёнаў пуд. кукру.

Цяпер на Вялікарускай тэрыторыі ёсьць 46 заводаў для нацыяналізацыі і 30 з іх спынілі работу. Пры рэорганізацыі гэтых бедных астаткаў расійскай цукравой прамысловасьці, як кажуць знатакі, ў крайнім выпадку і пры болей лепшых умовах выробы прадукцыя цукру дойдзе да 18—20 мільёнаў пудоў.

— **Штокгольм, 4/VI.** С. Пецярбургу паведамляюць. Згодна дэкрэту Маскоўскаго Савецкаго Ураду, уступаючаму у сілу 1-го чэрвеня, на тэрыторыі Сэвецкаго ураду ўведзена прымусовая трудавая павіннасьць. Усе грамадзяне будуць сілаю забірацца да грамадзкіх работ.

— **Рыга 1/IV.** Вярнуўшыйся гэтымі днямі с Прыволжья у Рыгу жыхар Прыбалційскіх правінцый паведамляе газ. «Балтыш. Цэйтунг» аб становішчы у Саратове вось што 15 мая паміж большэвікамі і вярнуўшыміся с фронта салдатамі пачаліся упартыя вулічныя бітвы, пры чым большэвікі былі прымушаны уцекаць. Аднак сабраўшыся у Татышчэве і назапасіўшыся артылерыяй, большэвікі вярнуліся 17 мая у места. Пачаўшыйся хутка артылерыйскі бой перанесся і на вакзал, так што поезд, у каторым ехаў сьведка, з вялікай апаскай выбраўся с—пад абстрэлу. Места да таго перапоўнено уцекачамі с безхлебных мейсц, штоў 4 нівялікіх дамох жылі да 50 сямейств.

Дзеля страху перад грабежствам і канфіскацыей транспарты тавараў на жалезніцы і па Волзе зусім спыніліся.

Весткі с Польшчы.

«Дзеннік Польскі» на аснове паведамленняў міністэрскіх дэлегатаў на з'ездзе прэсы падае весткі аб працы польскіх міністэрстваў. Робім выбарку нікаторых з іх.

Міністэрство земляробства разьвіло энэргічную чыннасьць над тым, каб зрабіць магчымым падняцце сельска-гаспадарскаго багацця Польшчы. Найпервей міністэрство стараецца злагодзіць земляробам тое што выкліканае ваенным часам найбліжэй іх тычыцца: рэквізыцыі і усякія наогул абследавання і часта з добрымі скуткамі. Для рукаводства у тым, што і як трэба рабіць міністэрство занялося зьбіраннем матэр'ялаў аб сельскай гаспадарцы у Польшчы працуючы да гэтаго усе таварыства і арганізацыі земляробаў і больш за 80 асобаў, каторыя прыслалі шмат матэр'ялаў. Апіраючыся на гэтых данных кніга, ужо бліжыцца канчацца друкам; мае 500 стр.

Дэпартамэнт аграрных рэформ працуе над стварэннем праэктаў права а так сама падбірае людзей здольных да земскай працы. Адкрыта школа каморнікаў і курсы для аграрных камісароў-знатакоў землеустройства і парцэляцыі.

Разам с працай падгатоўчаю, міністэрство выказуе жывую чыннасьць ужо цяпер, пераймаючы над сваю апеку дзержаўныя будынкі, выдаючы запамогі с.-гаспадарскай творчасьці, пераймаючы ад окупацыйных уладаў рожныя функцыі у дзеле с.-гаспадаркі.

Міністэрство у сваей аграрнай палітыцэ трымаецца поступовых тэорыяў Захаду і Усходу, але думае што поступ павінен ісьці дарогай эволюцыі («налево, але паціху»).

Чыннасьць міністэрства наогул вельмі жывая і захапляе усе бакі с.-гаспадарскаго жыц-

ця Польшчы.

Міністэрство здароўя, грамадзкай апекі і ахраны працы, падзялілося на адпаведныя аддзелы. У аддзеле пасрэдніцтва працы і эміграцыі займаюцца проэктам урэгуліравання эміграцыі і справай навароту часовых эмігрантаў, якіх вайна у 1914 годзе затрымала заграніцай каля 200000. Першы раз у Польшчы заняліся справай улепшэння быту с.-гаспадарскіх работнікаў. У гэтым кірунку міністэрство ідзе надта далёка, за прыкладам зах.-эўропэйскіх краёў У дзеле абароны працы міністэрство займаецца апрацаваннем правоў карыстаючы з вялікай практыкі зах.-эўр. рабочаго законодаўства; падгатаўляюцца праэкты правіл, нарміруючых стасункі паміж хадзяямі і работнікамі, інспэкцыі працы, мужской і кабецай, колеініяльных станоў, на аснове пар[и]тэту для разбору дзел паміж хадзяяміі і работнікамі, касс, забезпэчываючых ад нядугу (фабр. касс.) і г. і.

— «Дзеннік Всцульны» паведамляе, што склікання Рады Стану магчымо каля 20 чэрвеня.

— 1 гм. у Варшаве адбыўся XXV-ты зьезд прадстаўнікоў паветовых сэймікоў. Паміж іншымі справамі быў разгледжаны цікавы праэкт курсаў для валасных войтаў і пісароў. Курсы маюць быць некалькіднёвымі пераходнымі. Перад іх устройствам будзе выданы спэцыяльны падручнік.

Прэдстаўнік ураду паведаміў зьезд аб перагаворах с окупацыйнымі ўладамі, што да перадачы польскім уладам адміністрацыі земляробства справа стаіць на добрай дарозе.

— 1 і 2 гм. адбылося у Варшаве 3 пасядзэнні арганізацыйнай камісіі маючаго паўстаць польскаго «зьвязку мест». Былі дэлегаты ад 7 гарадоў.

Акростіх.

Быу есьць і будзе! Векамі ні згіне
Ен, моцны, магутны народ той на сьвеці,
Людзі каторага у гэтай часіне
Ачнуліся, усталі, праз тры аж сталецці.
Родная мова яго загрымела
Усюды, на краю усяму загудзела,
Склікае: «за працу, за дзела!»
М. М.

* * *

Каб я вольным арлом цяпер быу,
Палацеу бы я у горы далека;
Там гнязде сабе новае-б зьвіу
На скале нідаступнай высока.
У гнязде гэта я тады-б знес
Сірацінак з усей стараны:
Я стрымау бы паток іхніх слез
Й скрыу-б ад іх вобраз вайны.
Я б там іх нестававу, забауляу,
Насіу корму, крынічнай вады.
Днем і ночкаю-б іх пільнавау
Там ад сумнасьці, гора й бяды.
У іх душы б я расьціу, гадавау
Думкі вольныя й сьмеласьць арла;
Песьні ім бы я з ветрам сьпевау,
Каб жуда к ім прайсьці ні магла.
А як вырасьлі б кожнаму з іх
Каралеуствам скала бы была;
Там яны гадавалі б сваіх
Дзетак вольных, як дзеці арла!

Ю. Ф.

Тамбоу 1915/xi 15.

Прытчы беларускіх селян а большэвіках.

На Усебеларускім зьездзі у Менску у часе перарываў, нікаторыя с селян сьмяшылі аўдыторыю сваімі прытчамі а большэвіках.

Да гутаркі жывой дэкарацыяй служылі энэргічныя жэсты і выразная міміка, даходзючыя да артыстычнаго камізму. Нікаторыя прытчы арыгінальныя сваімі зраўненнямі мы тут даем.

Прытча I.

Беларуская аўтаномія падобна да печы, а большэвікі да засланкі. У печы стаяць гаршкі са смачнымі стравамі, але да іх трудна дабрацца. Як толькі палезеш да печы—адразу бэнц качаргою па лабаціне, нiможна чапаць, бо засланка чужая, большэвіцкая.

Прытча II.

Беларускі край падобен да верабья, а большэвікі да кулака. Ціскае гэты большэвіцкі кулак беларускаго верабья. Але настане час, калі верабей так укусіць большэвіцкі кулак што той крывёй абальецца ды моташна яму зробіцца.

Прытча III.

Беларускі лапаць ужо досіць стаптаўся, бо ён шмат людзей і народаў карміў хлебам. Ен хадзіў па усей Расіі, домы будаваў, астрогі мураваў, жэлезныя дарогі пракладываў, зямлю капаў золата дабываў; гэты лапаць і цяпер ішчэ мае вялікую моц: ён так ударыць у большэвіцкі карк, што той аж галаву адверніць.

Прытча IV.

Большэвіцкія дэкрэты падобны да шчэмкі, а народ да ката. Большэвікі даюць нібы то волю народу, але пры гэтым сваімі дэкрэтамі, яны яму зашчэмліваюць хвост. Ад гэтакай зашчэмленай волі аж зелена у вачох робіцца ад болі.

Прытча V.

Большэвіцкая «воля народная» падобна да бочкі без шпунта.

Бочка коціцца па вуліцах ад яе і стукат і грукат—яна робіць вялікі шум. Але зірніце на яе—тое, што было у ёй, вылілося, бо яна без шпунта—і большэвіцкая бочка асталася пустая...

Падаў да друку.

З. Б.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Хлебны паек ад заўтрашняго дня, 10 чэрвеня, зьменшыцца с 4-х фунт.—на 3½ ф. на тыдзен на порцыю.

Забарона на таргоулю у рэстаранах і сталоуках на аснові прыказау нямецкіх уласьцей, уходзіць у моц з гэтай нядзелі — па панядзелакам, чацьвергам і суботам, выключаючы мейсцы з ведама і згоды градоначальства, як напр. рэстар. Бэрэловіча.

Уплата пэнсіі за май пуцевым служачым Л. Р. ж. д. робіцца нямецкай адміністрацыяй.

Пэнсія за май управленцам троху затрымана з-за пустаты управленскай кассы.

Выплата—толькі окупацыйнымі грашамі, с прычын апошняго загаду нямецкіх уласьцей.

Мешчанская управа спыніла сваю ліквідацыю дзеля пераходa к меськаму самаупрауленню, апіраючыся на перамены у самаупрауленні с нараджэннем магістрата.

Мешчанская управа рада кожнаму выпадку, каб толькі як кольвечы адцягіваць сваю канчыну.

Лік членау рады давераных пры магістраце аканчацельно вызначэны у 18 чал.; ад іх—7 беларусау, 5 цалякоу, 5 еурэяу і 1 немец.

Быушыя заглауныя дзеячы У. З. С. К. З. Ф. амаль зданнаго у архіу,—Вырубау (старшыня камітэту), Мазурын (поунамоцны лясного аддзелу), Семеноу (поунамоцны матэрыяльна-загатавіц. аддзелу) і др. цяпер знаходзяцца у Маскве пры цэнтральным земсаюзным камітэці, дзе адчытываюцца за усю дзеяльнасьць па найболей важнаму заходнаму фронту, як прылучыушаму да Магілеускай стаукі.

Процiу нікаторых кіраунікоу В. З. С. К. З. Ф. будзе узбуджаны суд, ні выключаючы дзельцоу мобілізацыйн стала, працавауышага «на аборону» ад воінскай павіннасьці.

З укомплектаваннем магістрата у цэлым прапанавано рэформіраваць пасаду цяперашняго юрыс-кансульту пры управе, строга рэгламэнтыруючы яго правы і абавязкі, а так-сама і гонарар, вельмі залежачы ад «густаты» учыняемых зыскау да арэндатароў месьскіх зямель і інш.

Рэформа зямельнаго стала пры магістраце, зусім пасьпеушаго ішчэ у бытнасьць б. меськ. самаупраулення, мае быць праведзена у хуткім часе пасьля сфарміравання рады давераных.

Аб відах на ураджай с пауночных часьцей Менскаго павету, а так-сама з Вілейскаго пав. перадаюць, што быушыя халады і бездождзэ пагубна адбіліся на зярне і усходах.

Па усіх азнаках у гэтых мейсцах—пэуны нідарод.

На Торговым пляцу у пятніцу, 7 чэрвеня болей усяго можна было бачыць дровы, троху упаушыя у цане:

воз бяроз. — 16—18 руб.
» сасн. — 12—14 руб.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоунаг[о] камандавання за 6 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арміяу Кронпрынца Рупрэхта.

Часамі жывыя артылерыйскія бітвы, старанная разьв[е]дывацельная дзеяльнасьць. Пры адным нападзенні на фран[ц]узкія лініі мы ўзялі 2 афіцэраў і 50 салдат у палон.

Група арміяу Германскаго Кронпрынца.

На поле бітвы баевая дзеяльнасьць адмежовывалас[я] мейсцовымі бітвамі.

Пауночней р. Эн і пауночна—заходней Шато-Тьерр[и] былі адбіты варожыя частычныя нападзеніі. Паўночна Захо[д]ней Сарсі мы ўзялі пасьля сільнай артылерыйскай падга[]тоўкі варожыя лініі па абедзвым старанам Ардры. Мы ўзял[і] 300 палонных.

Першы-Генерал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Сярод еурэйскай абшчыны дзеля выбарау пастаяннаго прэзыдыума і 7 чл. камісіі ідзе гарачая агітацыя:—кожная с фракцыяу хоча, каб яе прэдстауніцтво было як найбольшым, ні лічучыся ні з якой прапорцыянальнасьцю.

Пэуна, што вазьмуць верх кандыдаты большасьці—„Бунда“ і „сыяністау“.

Спыненне епархіальнаго суда гонару і такіх жа органоу у благачыніях, як ні выказываючых амаль ніякай актыунай дзеяльнасьці, па ініцыятыве епіскапа Гэоргія, адбудзецца у хуткім часе.

Кооператыу пры «Русскомъ общественномъ собраніи», Захароуская 14, зачыніушыся пры акупацыі места, у хуткім часе зноу адчыняецца.

Астаткі майстэрні губ. земства (па Васкрэсенскай вул.), нідауна знішчэныя пажарам, перанесены на Старажоускую вул. у памешканне рамесьнай вучэбнай майстэрні.

Страты ад пажара вялікія.

Майстэрня, выраблявшая плугі і інш. сельск. гаспад. рэчы было прынята земствам, як вядома, ад саюза інжэнерау.

Праэкт пераробкі міліцыі у паліцыі зпрацованы паліцмэйстэром і па пацьвярджэнні яго граданачальствам будзе патроху праводзіцца у жыцце.

Цяперашнія штаты міліцыі будуць зьменьшаны.

У рэяльнай школе па аканчанні усіх экзамэнау і па роспуску пэдагагічнай рады, калі німажлівы ніякія просьбы, адміністрацыя абвешчала па дамах бацьком вучняу, ні унесшым платы за правоучэнне на другое паугодзе, што усе яны ад 1/VII будуць лічыцца уволенымі.

У польскім камітэці уцекачоу ад учэрайшаго дня, 8 чэрвеня, пачалася рэгістрація дзеля адпраукі уцекацоу у паветы менскай губ.

Заутра, 10 чэрвеня, па пытанню уцекачоу адбудзецца пасядзэнне Беларускай Рады.

Б. пачтова-тэлеграфныя чыноунікі і служачыя тутэйшай акругі, уеждажаушы у Оршу і Краснае (Смаленск. губ.), дзе знаходзіцца цяпер акружное упрауленне, свабодна атрымовываюць у салідных цыфрах належачую ім па мінскай службе пэнсію, ні выплачэную тут за апошнія месяцы, с прычын захвата мільеных сумм мінскаго почтамта польскімі легіанэрамі.

Гадавы сход членау сьв. Мікелаеускаго епархіальнаго брацтва, адбудзецца толькі сягоння 9 чэрвеня, у Юбілейным доме.

На гэтым сходзе, побач з брацкімі пытаннямі, будзе закрануто пытанне і аб скліківанні будучаго епархіяльнаго зьезду духавенства і міран дзеля абсуджэння матэрыяльна-прававых інтарэсау сьвяшчэнаслужыцелеу і аб рэформы мейсцовых духоуных школау.

Лекцыя у юбілейным доміі Панова па цэркоунаму пытанню адкладываецца на далей да выздараулення лектора.

Аб хлебным пайку, гэтак ніакуратна адпускаемым насяленню, меська харчовая камісія, аднакжэ, прэдасьцерэгае, што асобы, ні атрымаушыя сваей порцыі у срок трацюць право на атрыманне па ранейшым выпускам.

Курсы беларусазнаўства.

10 чэрвеня Лекцыя Т. Грыба (апошняя) «Нашыя песьняры».

Пачатак а 7 гадз.

11 чэрвеня Лекцыя Э. Будзькі: «Незалежная ці залежная прамысловасьць Беларусі».

Пачатак а 7 гадз.

Рэдактар **А. Прушынскі**.
Выдавецтво «**Т-во Заранка.**»

Друкарня Я. А. Грыныбаята.